## *ФІЛАСОФІЯ І САЦЫЯЛОГІЯ*

*УДК 101.1+001:06/.12(476)*

*А. А. ЛАЗАРЭВІЧ*

# ФІЛАСОФІЯ Ў СІСТЭМЕ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІЧНАЙ НАВУКІ: ГІСТОРЫЯ, ЗАДАЧЫ, ПЕРСПЕКТЫВЫ

*Інстытут філасофіі НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 08.11.2013)*

Гісторыя беларускай філасофіі XX–XXI стст. непарыўна звязана з гісторыяй Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ад самага заснавання Беларускай акадэміі навук філасофскія даследаванні і характэрныя для іх пытанні каштоўнасных, этычных, светапоглядных асноў грамадскага і культурнага развіцця знаходзіліся ў асяродку навуковага пошуку.

Варта мець на ўвазе, што і само стварэнне Беларускай акадэміі навук 1 студзеня 1929 года было не простай рэформай кіравання навуковым працэсам у маладой рэспубліцы. Сёння мы можам успрымаць гэту падзею як свайго роду гістарычны маніфест беларускай нацыі, выразна артыкуляванае жаданне валодаць уласнай інтэлектуальнай традыцыяй і ганарыцца ёю.

Для стварэння Беларускай акадэміі навук быў рэарганізаваны Інстытут беларускай культуры – першая навуковая ўстанова савецкай Беларусі, створаная на базе Навукова-тэрміналагічнай камісіі пры Наркамасветы БССР. Дарэчы, гэтая працэдура паўтарыла шлях стварэння шматлікіх новаеўрапейскіх акадэмій, якія, падобна легендарнай Французскай акадэміі, вядуць гісторыю ад супольнасці філосафаў і славеснікаў, якая сфарміравалася вакол праблем станаўлення нацыянальнай навукі і яе ўнікальнай мовы. З 1929 года ў Беларускай акадэміі навук функцыянавалі інстытуты гісторыі, мовы і літаратуры, фізіка-тэхнічны і хімічны. Разам з імі ў структуру новаетворанай Акадэміі ўвайшла секцыя марксізму-ленінізму, на базе якой у сакавіку 1931 года быў арганізаваны Інстытут філасофіі.

Безумоўна, для Беларускай акадэміі навук гэта быў вельмі патрэбны і своечасовы крок. Ён не толькі інтэграваў філасофію як вышэйшую тэарэтычную форму самасвядомасці культуры ў сістэму акадэмічных даследаванняў, адкрыў магчымасці для філосафаў удзельнічаць у асэнсаванні і ўладкаванні сацыякультурнай прасторы маладой беларускай дзяржавы, але і пацвердзіў права нашай Акадэміі на статус фундаментальнага даследчага цэнтра, які атрымаў у спадчыну лепшыя шматвяковыя традыцыі еўрапейскай навуковай думкі.

Аргументуючы гэты тэзіс, можна спаслацца на паходжанне тэрміна «Акадэмія» як імя ўласнага – назвы філасофскай школы Платона, а затым неаплатонікаў. Але і без таго ва ўсе стагоддзі, калі гэтае гучнае слова ўпрыгожвала сабою летапіс навукі, пачынаючы ад фларэнтыйскай акадэміі, створанай Козіма Медычы ў сярэдзіне XV стагоддзя, і да нашых дзён, філасофія займала ў структуры акадэмічных даследаванняў ганаровае месца. Філосафы П'ер Барден і Куро дэ ла Шамбр займалі крэслы сярод першай кагорты «несмяротных» легендарнай Французскай акадэміі ўзору 1635 года. Парады філосафа Готфрыда Лейбніца, заснавальніка і першага прэзідэнта Берлінскай акадэміі, узрушылі імператара Пятра І на адкрыццё акадэміі ў Пецярбургу. Можна прывесці мноства іншых, аддаленых у часе і зусім новых прыкладаў.

Філасофія, будучы не толькі зборам анталагічных праблем, але і ў першую чаргу пэўным спосабам мыслення, інструментарыем тэарэтычных метадаў, крытэрыем мэт і каштоўнасцей па-

знання, стаяла ля вытокаў большасці сучасных навук: фізіка-хімічных, біялагічных, медыцынскіх, навук аб зямлі. Ад самага пачатку яна была цесна звязана з матэматычнымі ведамі і тымі дысцыплінамі, якія, развіваючыся, набылі форму сучаснай тэорыі інфармацыі і алгарытмізацыі. На працягу стагоддзяў менавіта ў нетрах філасофіі зараджаліся ідэі, якія потым станавіліся краевугольнымі ў навуковай карціне свету, – ідэі прычыннасці і ўзаемасувязі, атамістычнай будовы матэрыі, універсальнай эвалюцыі, сістэмна-структурнай арганізацыі і да т. п. Не выклікае сумненняў сістэмаўтваральная роля філасофіі ў рамках сацыяльна-гуманітарных ведаў, яе прыярытэт у распрацоўцы паняццяў і канцэпцый, агульных для гісторыкаў, эканамістаў, сацыёлагаў, прававедаў, мастацтвазнаўцаў, такіх як форма і змест, каштоўнасць і сэнс, тлумачэнне і разуменне, дадатковая вартасць і капітал і мноства іншых.

У гэтым раскрываецца асаблівы культура- і чалавекастваральны сэнс філасофскага пошуку. Філасофія – не проста гуманітарная навука ў шэрагу іншых навук. Гэта выяўленне накіраванасці чалавека па-за межы звыклага свету, да непазнанага і непазнавальнага. Калі пафас прыродазнаўчых навук выяўляецца ў адвечным імкненні ў «аддаленыя абсягі» і «патаемныя глыбіні» матэрыі, прасторы і свядомасці, то пафас філасофіі, акрамя распрацоўкі адпаведнага метадалагічнага інструментарыю і абгрунтавання працэдур пазнання, заключаецца яшчэ і ў тым, каб сабраць у адзіную сістэму дасягненні ўсіх дысцыплін і пакласці гэты ансамбль у аснову стварэння больш шчаслівага жыцця чалавека, больш гуманнага, справядлівага, гарманічнага грамадства.

Было б недастаткова сказаць, што ў дачыненні да шматлікіх дысцыплін сучасных навуковых ведаў філасофія валодае толькі гістарычным і маральным аўтарытэтам. Філасофія – веды актуальныя і сучасныя. Высокі тлумачальны і прадказальны патэнцыял дэманструюць даследчыя праграмы і канцэпцыі, якія склаліся ў рэчышчы філасофскага пошуку, звязаныя з паняццямі дыялектыкі і герменеўтыкі, сінергетыкі і гарманістыкі, глабальнага каэвалюцыянізму і наасферызму. На памежжы філасофіі і прыродазнаўства, тэхнікі, медыцыны працягваюць нараджацца новыя навуковыя кірункі, якія валодаюць велізарным патэнцыялам: такімі на працягу XX стагоддзя сталі семіётыка, кібернетыка, сістэмалогія, сінергетыка, бія- і нанаэтыка, прыкладныя кірункі псіхалогіі і псіхіятрыі. Адной з найважнейшых сучасных задач філасофіі, у тым ліку і ў нашай краіне, з'яўляецца планамерная падрыхтоўка людзей да жыцця ва ўмовах імклівага развіцця высокатэхналагічнага грамадства.

Прыемна, што і беларускі Інстытут філасофіі ніколі на працягу сваёй гісторыі не заставаўся ўбаку ад надзённых праблем грамадскага развіцця, дэманструючы высокую ўцягнутасць у актуальныя формы інтэлектуальнага пошуку і на рэспубліканскім, і на міжнародным узроўні. Ідучы разам са сваёй краінай скрозь нялёгкія дзесяцігоддзі XX стагоддзя, Інстытут філасофіі ў кожную эпоху надаваў гэтаму пошуку адмысловую, гістарычна маркіраваную форму.

У 1930-я гады профіль дзейнасці інстытута быў абумоўлены дастасаваннем дыялектыка-матэрыялістычнай метадалогіі да задач культурнага і сацыяльна-эканамічнага будаўніцтва савецкага грамадства ў Беларусі. Важнае месца адводзілася крытычнаму аналізу заходняй («буржуазнай») філасофіі, тэорыі нацыянальнага пытання, вывучэнню ідэалогіі фашызму і фармуляванню метадаў барацьбы з ёй. У ліку найбольш важных апублікаваных прац былі працы першага дырэктара Інстытута філасофіі С. Я. Вальфсона «Супраць расавых тэорый» (1935), «Сям'я і шлюб у іх гістарычным развіцці» (1937), а таксама яго першага вучонага сакратара І. М. Ільюшына «К. Маркс і нацыянальнае пытанне» (1933) і інш.

Даследаванні першых пасляваенных дзесяцігоддзяў адрозніваюцца сістэмным падыходам да праблем тэорыі пазнання, логікі навуковага пошуку, гісторыі філасофіі (працы акадэмікаў Г. Ф. Аляксандрава, В. А. Сербенты, К. П. Буслава, У. І. Горбача, Д. І. Шыраканава і інш.). Новыя рашэнні актуальных праблем метадалогіі даследчай і творчай дзейнасці на матэрыяле біялогіі, фізікі, матэматыкі, фізіялогіі, кібернетыкі знайшлі адлюстраванне ў манаграфіях і зборніках прац, якія вывучаліся і абмяркоўваліся па ўсім Савецкім Саюзе. Сярод іх кніга П. Д. Пузікава «Філасофскія асновы эвалюцыйнага вучэння Дарвіна» (1959), а таксама першае ў сваім родзе калектыўнае даследаванне філосафаў і прыродазнаўцаў – кніга «Дыялектычны матэрыялізм як метадалогія прыродазнаўчага пазнання» (1965), выдадзеная пад рэдакцыяй В. І. Сцяпанава.

У 1950–1960 гг. у самастойны навуковы кірунак аформілася праблематыка гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Працамі У. І. Пічэты, І. Н. Лушчыцкага, В. А. Сербенты, М. А. Алексютовіча, К. С. Пракошынай, У. М. Конана, Э. К. Дарашэвіча, С. А. Падокшына, Я. І. Парэцкага і іншых даследчыкаў быў закладзены падмурак вывучэння беларускага Адраджэння і Рэфармацыі. Даследаваліся гістарычныя перадумовы станаўлення гуманістычных ідэй у Беларусі, светапоглядны змест Статутаў Вялікага Княства Літоўскага, дзейнасць праваслаўных братэрстваў, Брэсцкая царкоўная ўнія, рэлігійная палемічная літаратура.

У 1970-я гг. філосафы АН БССР зрабілі значны ўнёсак у даследаванне асноўных тэндэнцый развіцця сталага сацыялістычнага грамадства, прынцыпаў гуманізацыі грамадскіх адносін, культурнага і выхаваўчага патэнцыялу навукова-тэхнічнага прагрэсу. Распрацоўкі па дадзеным кірунку звязаны з імёнамі Я. М. Бабосава, В. І. Боўша, С. Д. Лапцёнка і інш. Калектыўная манаграфія супрацоўнікаў Інстытута філасофіі і права «Гуманізацыя грамадскіх адносін і ўзрастанне актыўнасці працоўных» была ўзнагароджана ў 1977 г. Дыпломам ІІІ ступені ВДНГ СССР, а кіраўнік аўтарскага калектыву акадэмік АН БССР К. П. Буслаў – бронзавым медалём ВДНГ СССР. Паралельна разгортвалася праграма даследаванняў па праблемах рацыянальнасці, сучаснай метадалогіі навуковага пазнання, канцэптуальных асноў гарманізацыі сацыяпрыродных адносін. З’явіліся значныя калектыўныя манаграфіі – «Творчасць у навуковым пазнанні» пад агульнай рэдакцыяй чл.-кар. Д. І. Шыраканава і Ю. А. Харына (1976), «Дынамічная раўнавага чалавека і прыроды» пад рэдакцыяй Д. І. Шыраканава, А. І. Філюкова, П. А. Вадап’янава (1977), «Заканамернасці развіцця і метады пазнання сучаснай навукі», рэдактарамі якой выступілі А. К. Манееў і Д. І. Шыраканаў (1978). Пабачылі свет новыя арыгінальныя працы, якія раскрывалі асаблівасці гістарычных этапаў станаўлення беларускай інтэлектуальнай традыцыі. Гэта, у прыватнасці, кнігі «Нарысы гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі да 1917 г.» (1973), «Ідэі гуманізму ў грамадска-палітычнай і філасофскай думцы Беларусі (дакастрычніцкі перыяд)» (1977), над якімі працавалі У. М. Конан, С. А. Падокшын, А. С. Майхровіч, С. Ф. Сокал, М. С. Купчын і іншыя даследчыкі. У 1984 г. цыкл калектыўных прац па гісторыі філасофіі і грамадскай думкі Беларусі дакастрычніцкага перыяду быў узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй БССР. Калектыўная манаграфія «Дэтэрмінізм: сістэмы, развіццё» ў 1986 г. атрымала Дыплом І ступені ВДНГ СССР, а кіраўнік аўтарскага калектыву акадэмік Д. І. Шыраканаў быў узнагароджаны залатым медалём ВДНГ СССР.

Пачынаючы з сярэдзіны 1980-х гг., у кантэксце ўзятага краінай курсу на перабудову сацыяльна-эканамічных адносін, у кола даследчых кірункаў былі ўключаны распрацоўка механізмаў актывізацыі чалавечага фактару ў сацыяльна-эканамічным жыцці, філасофска-антрапалагічныя праблемы моладзі, тэарэтыка-метадалагічныя асновы праватворчасці і пабудовы прававой сістэмы. У гады незалежнасці былі працягнуты сістэматычныя даследаванні ў галіне прававых асноў фарміравання беларускай дзяржаўнасці, каштоўнасна-светапоглядных аспектаў нацыянальнай самасвядомасці. Значнай вяхой гэтага перыяду стала манаграфія чл.-кар. А. С. Майхровіча «Пошук праўдзівага быцця і чалавека. З гісторыі філасофіі і культуры Беларусі» (1992), узнагароджаная прэміяй Акадэміі навук Беларусі. Былі апублікаваны і значныя метадалагічныя працы, такія як кніга «Стэрэатыпы і дынаміка мыслення» (1993) – сумесная праца мінскіх і маскоўскіх філосафаў, «Высокія тэхналогіі ў структуры ўстойлівага развіцця: праблема адпаведнасці наасферным каштоўнасцям» (2009) – беларуска-малдаўская манаграфія, падрыхтаваная пад кіраўніцтвам акадэмікаў Д. І. Шыраканава і А. Д. Урсула, узнагароджаная ў 2010 г. прэміяй Акадэмій навук Украіны, Беларусі і Малдовы.

Пад эгідай Інстытута філасофіі ў 1970–1990 гг. канчаткова аформіліся пяць вядучых кірункаў даследаванняў, якія сёння вызначаюць аблічча беларускай філасофскай навукі.

Па-першае, гэта даследаванні ў галіне тэорыі і метадалогіі пазнання, філасофіі навукі, якія мелі прамое дачыненне да развіцця інтэлектуальнага патэнцыялу асобы, грамадства, культуры, удасканалення нормаў навуковага пазнання і сацыяльна-гуманітарнай экспертызы розных сфер грамадскага быцця, прагрэсу распрацовак у галіне метадалогіі дзяржаўнага будаўніцтва, сацыяльнага кіравання, адукацыі і выхавання, камунікацыі, міжкультурнага ўзаемадзеяння і інтэграцыі. Школа ў галіне логіка-метадалагічных асноў і структур навуковага пазнання, якая склалася ў Інстытуце філасофіі, сваімі каранямі цесна пераплятаецца з мінскай метадалагічнай школай, чыя слава грымела па ўсім Савецкім Саюзе ў 1960–1980-я гады. Прыкметнай падзеяй у інтэлек-

туальным жыцці краіны стаў шэраг публікацый вучоных, якія працавалі ў Інстытуце філасофіі на розных этапах сваёй біяграфіі альбо цесна супрацоўнічалі з ім, – Д. І. Шыраканава, У. Ф. Беркава, А. М. Елсукова, І. І. Жбанковай, У. М. Калмыкова, П. В. Кікеля, Ч. С. Кірвеля, Л. Ф. Кузняцовай, А. К. Манеева, У. К. Лукашэвіча, А. І. Осіпава, М. А. Слямнёва, Э. М. Сарокі, У. А. Гераіменкі, В. П. Старжынскага, А. П. Трафіменкі, У. І. Чуешова, Я. С. Яскевіч і іншых.

Лагічным развіццём гэтых даследаванняў стала зараджэнне беларускай навуковай школы ў галіне тэорыі і метадалогіі станаўлення інфармацыйнага грамадства. Яе ідэйнай і метадалагічнай базай сталі працы беларускіх філосафаў Я. М. Бабосава, М. І. Жукава, Л. В. Уварава, Я. В. Дзмітрыева, Г. І. Шчарбіцкага, У. А. Гераіменкі. Задачы школы на сучасным этапе звязаны з аналізам перадумоў і механізмаў пераходу сучаснага беларускага грамадства ад індустрыяльнай да постіндустрыяльнай стадыі развіцця, раскрыццём ролі, якую адыгрываюць у гэтым працэсе інфармацыя і веды, тэхніка і тэхналогіі, рацыянальныя камунікатыўныя практыкі і сродкі сацыялізацыі найноўшых высокатэхналагічных прадуктаў. Рашэнню гэтых і іншых задач прысвечаны буйныя навуковыя працы апошніх гадоў: манаграфіі А. А. Лазарэвіча «Навуковыя веды ў інфармацыйным грамадстве» (1993), «Глабальнае камунікацыйнае грамадства» (2008), калектыўная манаграфія «Надыходзячае інфармацыйнае грамадства» (2006).

Па-другое, значнае месца ў дзейнасці інстытута займае аналіз філасофскіх праблем чалавека і грамадства ва ўмовах глабальных трансфармацый. Нашымі даследчыкамі закладзены тэарэтычныя асновы мадэлі сацыяльна-сістэмнай якасці чалавека, якія злучаюць свядомасць і дзейнасць з канструктыўнымі і дэструктыўнымі сіламі, дэтэрмінаванымі сацыяльнай сістэмай, прааналізаваны механізмы засваення грамадскіх каштоўнасцей, шляхі ўздзеяння маральных якасцей асобы на сацыяльны свет і яго пераламленне праз прызму гэтых якасцей. Значны ўнёсак у развіццё этычных ведаў зрабілі Я. М. Бабосаў, С. П. Вінакурава, С. Д. Лапцёнак і інш. У працах вучоных Інстытута філасофіі разгледжаны актуальныя для нашай эпохі праблемы рэгуляцыі духоўна-культурных працэсаў. Гэтай праблематыцы прысвечаны, у прыватнасці, манаграфіі Т. І. Адулы «Філасофія ў сістэме духоўнай культуры: праблемы сацыяльнага функцыянавання» (1993), «Чалавек на мяжы тысячагоддзяў: пошук духоўных падстаў быцця» (2003), праца Т. І. Адулы і В. А. Паўлоўскай «Чалавек ва ўмовах сацыяльных трансфармацый» (2006). Вынікам шматгадовых даследаванняў у галіне гуманітарнай бяспекі сучаснага беларускага грамадства стала выданне калектыўнай манаграфіі «Бяспека Беларусі ў гуманітарнай сферы: сацыякультурныя і духоўна-маральныя праблемы» (2010).

Працягваючы традыцыі першых айчынных рэлігіязнаўчых даследаванняў, распачатых у 1960-я гг., актыўна развіваецца акадэмічная школа рэлігіязнаўства, якая характарызуецца паслядоўнай навуковай і свецкай арыентацыяй і практыка-экспертнай скіраванасцю. Найбольшы ўнёсак у яе дзейнасць зрабілі лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР К. С. Пракошына, а таксама Т. П. Кароткая, І. Ф. Рэкуц, В. У. Старасценка, Н. А. Кутузава і іншыя навукоўцы. Да ліку найбольш значных выданняў, падрыхтаваных імі ў 1990–2000 гг., можна аднесці манаграфіі «Хрысціянства ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць» (2000), «Нацыя, рэлігія і дзяржаўнасць у палемічнай літаратуры Беларусі» (2005), кнігі па праблематыцы неакультаў, беларуска-расійскае выданне «Анталогія айчыннага рэлігіязнаўства. Рэлігіязнаўства ў Беларусі» (2010), беларуска-польскую манаграфію «На памежжы. Нарысы па філасофіі рэлігіі» (2011).

Па-трэцяе, вялікая ўвага ў Інстытуце філасофіі надаецца распрацоўцы сацыяльна-філасофскіх аспектаў праблем экалогіі. Традыцыі навуковай школы ў галіне сацыяльнай экалогіі доўжацца звыш 30 гадоў. Менавіта ў Інстытуце філасофіі з канца 1970-х гг. пачаліся першыя ў рэспубліцы даследаванні па філасофскіх аспектах сацыяпрыроднага развіцця. Прызнаным лідарам гэтага кірунку з'яўляецца чл.-кар. НАН Беларусі П. А. Вадап'янаў. У распрацоўку філасофскіх асноў сацыяльнай экалогіі значны ўнёсак зрабілі І. Я. Жыбуль, А. І. Зелянкоў, Н. Я. Захарава, С. П. Анупрыенка, А. С. Чэрвінскі.

Па-чацвёртае, на сучасным этапе гісторыі інстытута атрымала годны працяг традыцыя гісторыка-філасофскіх даследаванняў. На высокім навуковым узроўні падрыхтаваны шматлікія публікацыі А. С. Майхровіча, С. А. Падокшына, У. М. Конана. Новую генерацыю акадэмічных гісторыкаў філасофіі прадстаўляюць В. Б. Евароўскі, І. М. Бабкоў, С. І. Санько, А. В. Дзерман

і іншыя даследчыкі. Дзякуючы іх напружанай працы ў 2000-я гады пачалася рэалізацыя найважнейшых іміджавых праектаў Інстытута філасофіі – выдадзены 3 тамы «Гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі», 1-ы том «Гісторыі эстэтычнай думкі Беларусі».

Нарэшце, пяты кірунак, які атрымаў актыўнае развіццё ў апошнія гады, – гэта даследаванні ў галіне светапоглядных асноў і метадалагічных прынцыпаў міжкультурнага дыялогу і інтэграцыі, навукова-аналітычная праца, якая выконваецца ў падтрымку прадуктыўнага ўваходжання Рэспублікі Беларусь у інтэграцыйныя праграмы і праекты еўрапейскага і еўразійскага маштабу. Інстытут актыўна супрацоўнічае са знешнепалітычным ведамствам нашай краіны, замежнымі дыпламатычнымі місіямі ў Рэспубліцы Беларусь. Вынікам гэтай працы сталі прыкметныя кніжныя выданні, такія як манаграфія І. Я. Левяша «Глабальны свет и геапалітыка» (2012), калектыўныя манаграфіі «“Новы рэгіяналізм” і беларуска-расійскае прыгранічча» (2012) пад рэдакцыяй І. Я. Левяша, «Рэспубліка Беларусь – Еўрапейскі саюз: праблемы і перспектывы партнёрства» (2013) пад рэдакцыяй чл.-кар. Л. Ф. Яўменава, а таксама серыя канферэнцый, арганізаваных сумесна з прадстаўніцтвам ЕС у Беларусі, Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывай, пасольствамі Кітая, Індыі, Ірана і іншых дзяржаў.

Азіраючыся на досыць доўгую, шматстайную, насычаную гісторыю акадэмічнага Інстытута філасофіі, міжволі задаешся пытаннем: што можна лічыць найважнейшым вынікам яго дзейнасці на працягу васьмідзесяці з лішкам гадоў? Уяўляецца, што асноўнае дасягненне ў тым, што духоўная культура незалежнай Беларусі крышталізавалася вакол свайго інтэлектуальнага, навукова-філасофскага стрыжня, і сёння беларуская філасофія ўяўляе сабой самастойны яркі феномен еўрапейскай інтэлектуальнай прасторы, а гісторыя філасофскай думкі Беларусі стала неад’емнай часткай сусветнай філасофскай гісторыі.

Сёння траекторыя дзейнасці Інстытута філасофіі пралягае ў адмысловай «трохмернай прасторы», у сістэме трох каардынат. Гэта, па-першае, еўрапейскія і сусветныя тэндэнцыі актуальных філасофскіх даследаванняў; па-другое, праблемы сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства, якія патрабуюць тэарэтычнага вырашэння; па-трэцяе, прыярытэты, звязаныя з павышэннем міждысцыплінарнай і навукова-практычнай значнасці філасофскіх распрацовак. Першай з нашых магістральных задач з’яўляецца нарошчванне інтэлектуальнага капіталу беларускай філасофскай думкі і адначасова – цеснае ўзаемадзеянне з органамі дзяржаўнай улады, з рэальным сектарам эканомікі ў справе экспертна-метадалагічнага забеспячэння розных кірункаў адміністрацыйнай і гаспадарчай дзейнасці, грамадскага інфармавання, кадравай працы. Другая задача – узаемадзеянне з даследчымі ўстановамі прыродазнаўчага і тэхнічнага профіляў у сферы навуковай эўрыстыкі, метадалогіі навуковага пошуку, прадуктыўнага сінтэзу гетэрагенных даследчых праграм і працэдур. Трэцяя фундаментальная задача – забеспячэнне тэарэтычных, метадалагічных, маральных, эстэтычных асноў развіцця беларускага грамадства, прагрэсу сістэмы адукацыі, выхаванне новых пакаленняў беларускіх грамадзян.

На сённяшні дзень Інстытут філасофіі – гэта не проста «храм» найстарэйшай з усіх навук, але і эфектыўная «фабрыка», прадукцыя якой – экспертныя веды, сацыяльна-гуманітарныя тэхналогіі, эфектыўныя метадалагічныя рэцэпты для розных кірункаў вытворча-эканамічнай і сацыяльна-культурнай дзейнасці. Інстытут філасофіі з’яўляецца асноўным у краіне навуковым цэнтрам у галіне філасофскага пазнання і адукацыі, ажыццяўляе падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў галіне філасофіі, забяспечвае неабходны філасофскі кампанент у падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. Ён валодае ўнікальным тэарэтыка-метадалагічным і кадравым патэнцыялам для правядзення сістэмных міждысцыплінарных даследаванняў у галіне інавацыйнага развіцця сучаснага грамадства, здольны рэалізаваць свой патэнцыял у якасці даследчай пляцоўкі па вывучэнню праблем інфармацыйнага грамадства, якасці адукацыі і выхавання чалавека, перспектыў выкарыстання НБІКС-тэхналогій. У апошнія гады профіль дзейнасці інстытута быў эфектыўна пашыраны за кошт стратэгічных еўрапейскіх і еўразійскіх даследаванняў, распрацоўкі метадалогіі і культурных асноў шматвектарнай палітыкі беларускай дзяржавы, інтэграцыі нашай краіны ў глабальную сацыяльна-культурную і навукова-тэхнічную прастору, а таксама за кошт распрацовак у галіне карпаратыўнай культуры, менеджменту ведаў і прафесійнага вопыту на прадпрыемствах і ў арганізацыях.

Зразумела, было б вялікім перабольшаннем сказаць, што гэтыя задачы ў прынцыповым плане ўжо вырашаны, што ў працы над імі дасягнута стопрацэнтная эфектыўнасць. Што ж перашкаджае іх рашэнню? Адказваючы на гэтае пытанне, можна спаслацца як на цяжкасці агульнага парадку, якія характарызуюць развіццё ўсёй навуковай сферы Беларусі, так і на больш прыватныя, якія датычаць перш за ўсё гуманітарнай навукі. Да першага разраду варта аднесці недастатковае фінансавае і кадравае забеспячэнне навуковага працэсу. Інстытут філасофіі, як і шматлікія іншыя інстытуты, узяў на сябе цяжар адказных навукова-інавацыйных задач досыць шырокага спектра. Часам нават дзіўна, як з імі спраўляецца штат супрацоўнікаў, які ў апошнія некалькі год не перавышае па колькасці 50 чалавек, дэманструючы пры гэтым зусім не нізкую выніковасць. Няпроста прыцягнуць і, галоўнае, утрымаць у акадэмічнай навуцы маладых таленавітых даследчыкаў, вытрымаць канкурэнцыю з ВНУ за праслойку найбольш кваліфікаваных кадраў.

Да другога разраду варта аднесці праблемы, звязаныя з не заўсёды дакладным, адэкватным успрыманнем задач і спецыфікі функцыянавання гуманітарнай навукі. Часта ад гуманітарыяў чакаюць, што яны, падобна пракорам, пакажуць адзін дакладны, беспамылковы «шлях», якім павінна ісці палітыка, эканоміка, культура, а не дачакаўшыся такога ўказання, схіляюцца да таго, каб лічыць іх працу безвыніковай. Нярэдка мы сутыкаемся з неразуменнем таго, што якасць і паўнавартаснасць навуковых даследаванняў залежаць ад іх разнастайнасці, ад іх узбагачэння новымі, незвычайнымі, нават парадаксальнымі ідэямі, якія нярэдка нараджаюцца «на перыферыі» прыярытэтных кірункаў навукі. Таму імкненне механічна скараціць спектр даследаванняў, сканцэнтравацца толькі на асобных «прарыўных» кірунках можа прывесці да збяднення ўсёй навуковай сферы, да паніжэння навуковага ўзроўню і якасці распрацовак па саміх прарыўных кірунках. Наносіць удар па нашай дзейнасці і па яе грамадскаму статусу адсутнасць гнуткай, дыферэнцыраванай сістэмы крытэрыяў якасці і паспяховасці.

Гуманітарная навука ў рэспубліцы пакутуе ад праяўленай некаторымі сродкамі масавай інфармацыі абыякавасці да вынікаў сур'ёзных, фундаментальных даследаванняў, ад пагоні толькі за «смажанымі» фактамі і «гучнымі» загалоўкамі. Бясспрэчна, грамадская свядомасць далёка не заўсёды можа з лёгкасцю «засвоіць» сфармуляваны на тэарэтычным узроўні навуковы вынік. Але гэта – праблема не навукі, гэта – недахоп механізмаў трансляцыі навуковых высноў у грамадскую свядомасць, нежаданне і негатоўнасць СМІ ўзяць на сябе функцыю тлумачэння, папулярызацыі, схіліць грамадскую думку на карысць навуковай сферы. Ці не найбольшая шкода наносіцца гуманітарнай навуцы размыццём крытэрыяў і межаў «экспертных ведаў» – гэта значыць той акалічнасцю, што да ліку «экспертаў» у галіне палітыкі, эканомікі, сацыяльнай дынамікі навукі і культуры ў наш час залічваецца практычна любы аратар, які выступае са старонак СМІ, незалежна ад наяўнасці або адсутнасці сапраўднага акадэмічнага статусу, даследчых заслуг.

Разам з тым філасофская навука ў НАН Беларусі працягвае паспяхова развівацца. З пачаткам XXI стагоддзя Інстытут філасофіі пачаў рэалізацыю маштабнай праграмы па распрацоўцы тэарэтыка-метадалагічных асноў устойлівага інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь у сацыяльна-культурнай, навукова-тэхнічнай, духоўна-маральнай сферах. Наладжана плённае супрацоўніцтва па рэалізацыі дадзеных мерапрыемстваў з органамі дзяржаўнай улады, грамадскімі арганізацыямі, царквой.

На працягу некалькіх апошніх год у Інстытуце філасофіі сфармулявана канцэпцыя фарміравання духоўна-маральных асноў нацыянальнай стратэгіі развіцця і забеспячэння гуманітарнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, нейтралізацыі маральна-прававых фактараў дэвіянтных паводзін, процідзеяння рэлігійнаму, этнічнаму, рэлігійна матываванаму палітычнаму радыкалізму. Супрацоўнікамі інстытута створана і паспяхова апрабавана методыка экспертызы публічнай рэкламы. Яна засноўваецца на маральна-эстэтычных крытэрыях і працэдурах семіялагічнага аналізу, арыентавана на экспертызу рэкламнай прадукцыі ў адпаведнасці з дзейсным заканадаўствам, выяўленне выпадкаў уводзін спажыўцоў у зман. Выкарыстанне гэтай методыкі стварае ўмовы для сістэмнай маральна-эстэтычнай экспертызы рэкламы і публікацый у сродках масавай інфармацыі, недапушчэння супрацьпраўных і неэтычных метадаў канкурэнтнай барацьбы, папярэджання прамой і ўскоснай прапаганды амаралізму, антыэстэтычных, радыкальных і экстрэмісцкіх поглядаў і ідэй.

Супрацоўнікамі Інстытута распрацавана метадалогія даследавання дынамікі ідэйна-светапогляднай прасторы Беларусі з улікам уласцівага нам памежжа культур. Дадзеная распрацоўка арыентавана на вызначэнне ключавых асаблівасцей інтэлектуальнай культуры Беларусі, іх генезісу ў кантэксце ідэйна-светапогляднага ўзаемадзеяння культур Усходу і Захаду, іх уплыву на ментальнасць і калектыўную псіхалогію беларускай нацыі. Гэта дазваляе раскрыць узаемасувязь філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі з каштоўнаснымі кампанентамі нацыянальнай і сусветнай культуры, абгрунтаваць працэсы станаўлення нацыянальнай ідэнтычнасці Беларусі ў кантэксце шматбаковай узаемасувязі гісторыка-культурных традыцый.

Варта назваць яшчэ адну перспектыўную прыкладную распрацоўку Інстытута, якая датычыцца планавання і ажыццяўлення сацыякультурных інавацый у адносінах да стратэгічных задач постіндустрыяльнага развіцця Беларусі. Гаворка ідзе аб методыцы павышэння інфармацыйна-арганізацыйнай культуры і крэатыўнасці кіраўнікоў і спецыялістаў прадпрыемстваў, якая ўключае ў сябе логіка-кагнітыўныя сродкі стымулявання творчай актыўнасці, механізмы прыняцця і рэалізацыі рашэнняў на аснове навучання навыкам менеджменту ведаў, уключэння ў прафесійныя, экспертныя сеткі і супольнасці для вырашэння праблемна-арыентаваных задач. З дапамогай дадзенай методыкі можа быць забяспечана павышэнне эфектыўнасці бізнес-працэсаў, удасканаленне працэдур распрацоўкі і прыняцця рашэнняў кіраўнікамі і спецыялістамі прадпрыемстваў са станоўчым эфектам для вытворчай, маркетынгавай, кадравай дзейнасці.

Прыкладная эфектыўнасць вынікаў даследаванняў і распрацовак Інстытута філасофіі вызначаецца іх укараненнем у вучэбна-выхаваўчы працэс устаноў вышэйшай і сярэдняй адукацыі, сістэму падрыхтоўкі навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі; выкананнем заданняў па інфармацыйна-аналітычнаму суправаджэнню дзейнасці Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі, Міністэрства гандлю, Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей, Прэзідыума НАН Беларусі, іншых ведамстваў і ўстаноў; выкарыстаннем у розных галінах сацыяльнага планавання і кіравання; папулярызацыяй інтэлектуальна-духоўнай спадчыны Беларусі, асноў рацыяналістычнага светапогляду і традыцыйных маральных каштоўнасцей, прынцыпаў талерантнасці і гуманізацыі грамадскіх адносін у сродках масавай інфармацыі. Толькі за 2007–2012 гг. Інстытутам філасофіі атрымана звыш 140 даведак і актаў аб укараненні навуковых вынікаў, два дзясяткі лістоў аб зацікаўленасці ў іх наступным выкарыстанні.

Інстытутам філасофіі вядзецца шырокая адукацыйная і культурна-асветная праца з моладдзю і студэнцтвам. У адпаведнасці з дагаворам з Мінскім гарадскім палацам дзяцей і моладзі арганізаваны пасяджэнні «Школы маладога філосафа» для мінскіх старшакласнікаў. На базе ўстаноў адукацыі Фрунзенскага раёна г. Мінска вядзецца праца кружкоў па асновах экалагічнай бяспекі. Заключаны перспектыўныя дагаворы аб супрацоўніцтве з шэрагам ВНУ краіны, Мінскім абласным інстытутам развіцця адукацыі. Значную папулярнасць і вагу ў навуковым асяроддзі набылі метадалагічныя семінары Інстытута філасофіі, разлічаныя як на прафесійных даследчыкаў, так і на аўдыторыю аспірантаў, магістрантаў, студэнтаў. Гэта семінары «Філасофскія праблемы прыродазнаўства і тэхнікі», «Чалавек і грамадства ў XXI стагоддзі», «Гісторыя ідэй», тэарэтычны семінар маладых вучоных.

Адказваючы на запатрабаванні часу, інстытут актыўна ўключаецца ў дзейнасць па фарміраванню інтэграваных даследча-адукацыйных структур, пераадоленню міжведамасных бар'ераў паміж акадэмічнай і ўніверсітэцкай навукай. На працягу многіх дзесяцігоддзяў мы плённа супрацоўнічалі з кафедрамі філасофіі і гуманітарных дысцыплін шматлікіх мінскіх і рэгіянальных ВНУ, сумесна выконваючы заданні дзяржаўных навуковых праграм, асобныя праекты, супрацоўнічалі ў галіне падрыхтоўкі навуковых кадраў. Але зараз наспеў час зрабіць новыя крокі, ажыццявіць на практыцы перспектыўны кластэрны прынцып навуковага працэсу. Дзеля гэтага адпрацоўваюцца розныя формы навукова-ўніверсітэцкай кааперацыі. Па-першае, адкрыццё на базе інстытута філіялаў кафедр ВНУ. На сённяшні дзень створаны дзве такія структуры: філіялы кафедры філасофіі і метадалогіі навукі, а таксама кафедры паліталогіі БДУ. Па-другое, сумесныя навукова-адукацыйныя кафедры-лабараторыі, якія спалучаюць даследчы працэс з профільнай падрыхтоўкай (праз сістэму навучальнай практыкі, кіраўніцтва курсавымі і дыпломнымі работамі і г. д.) і прафарыентацыяй студэнтаў. У 2013 годзе сумесна з Інстытутам сацыяльна-гуманітарнай аду-

кацыі БДЭУ Інстытут філасофіі заснаваў кафедру-лабараторыю сацыяльна-гуманітарнай экспертызы ў галіне навукі і адукацыі. Нарэшце, разам з кафедрай філасофскіх навук і ідэалагічнай работы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь разглядаецца стварэнне інавацыйнай пляцоўкі для ажыццяўлення сумесных распрацовак з прыцягненнем даследчых і ўкараняльных структур з трэцяга боку. Такая пляцоўка мусіць стаць праобразам галіновага навукова-тэхнічнага цэнтра ў галіне гуманітарных ведаў і тэхналогій.

Хацелася б асабліва адзначыць унёсак Інстытута філасофіі ў фарміраванне пазітыўнага іміджу Рэспублікі Беларусь на міжнароднай арэне. Ён выяўляецца, перш за ўсё, у экспертнай падтрымцы знешнепалітычнага курсу краіны. Так, у інтарэсах МЗС Рэспублікі Беларусь выкананы асобны інавацыйны праект, накіраваны на стварэнне інфармацыйна-аналітычнай сістэмы па развіццю стратэгічнага партнёрства Рэспублікі Беларусь з Еўрапейскім саюзам і дзяржавамі еўразійскай прасторы ў сацыякультурнай і навукова-тэхнічнай абласцях. Вядуцца даследаванні ў сферы выяўлення і запаўнення існуючых інфармацыйных і аксіялагічных лакун, неспрыяльных стэрэатыпаў і дэзынфармацыі адносна Беларусі і беларускай нацыі ў замежнай інфармацыйнай прасторы.

Штогод Інстытут філасофіі арганізуе да 20 міжнародных навуковых канферэнцый, круглых сталоў, семінараў, прэзентацый, у тым ліку з фінансаваннем за кошт замежных дыпламатычных прадстаўніцтваў (пасольствы ЕС, ФРГ, Эстоніі, Кітая, Ірана, Індыі), міжнародных арганізацый і навуковых фондаў. У ліку мерапрыемстваў, якія зрабілі прыкметны ўплыў на інтэлектуальнае жыццё нашай краіны і блізкага замежжа, – канферэнцыі «Нацыянальная філасофія ў кантэксце сучасных глабальных працэсаў» (снежань 2010 г.), «Філасофія ў Беларусі і перспектывы сусветнай інтэлектуальнай культуры» (красавік 2011 г.), «Беларусь і Расія ў еўрапейскім кантэксце: праблемы дзяржаўнага кіравання працэсам мадэрнізацыі» (кастрычнік 2011 г.), «Сям'я і жанчына ў сучасным свеце: сацыяльныя і культурныя аспекты» (люты 2012 г.), «Рэспубліка Беларусь – Еўрапейскі саюз: праблемы і перспектывы партнёрства» (чэрвень 2013 г.). Навуковыя форумы праводзяцца як на базе інстытута, так і ў рэгіёнах Беларусі, а таксама за мяжой (у апошнія гады адбыліся канферэнцыі ў Вільнюсе, Харкаве, Казані, Адэсе). Сукупная колькасць удзельнікаў гэтых мерапрыемстваў за 2009–2012 гг. перавысіла 3000 чал. З лекцыямі, дакладамі ў інстытуце выступалі пасла Балгарыі, Кітая, Румыніі, Эстоніі, Японіі. У мерапрыемствах інстытута ўдзельнічалі кіраўнікі дыпламатычных місій Расіі, Казахстана, Малдовы, Украіны.

Развіваецца міжнародная выдавецкая дзейнасць. Так, за 2009–2012 гг. за мяжой выдадзена звыш 15 найменняў кніг супрацоўнікаў інстытута. Геаграфія кнігавыдання – Расія, Украіна, Польшча, Германія, Францыя, ЗША; мова выданняў – руская, польская, англійская. Заснавана кніжная серыя «Філасофская і палітыка-прававая думка сусветных цывілізацый», у рамках якой выпушчаны шэраг выданняў навуковай і навукова-папулярнай літаратуры.

Такім чынам, сёння Інстытут філасофіі НАН Беларусі не толькі шчыльна інтэграваны ў сістэму міжнародных навуковых сувязей, міждысцыплінарных даследаванняў, але і актыўна ўдзельнічае ў вырашэнні актуальных задач, якія стаяць перад беларускім грамадствам і дзяржавай. Перспектывы развіцця інстытута непарыўна звязаны з абнаўленнем і ўдасканаленнем стратэгіі фундаментальных філасофскіх даследаванняў, формы выкладання іх вынікаў для максімальна шырокага кола зацікаўленых асоб і патэнцыяльных спажыўцоў навуковай прадукцыі. Іншымі словамі, перад Інстытутам стаіць комплекс і чыста навуковых, і навукова-прыкладных, і інавацыйных задач. Будучыня беларускай акадэмічнай філасофіі – у руках таленавітых вучоных, якія працуюць над іх вырашэннем.

*A. A. LAZAREVICH*

**PHILOSOPHY IN THE SYSTEM OF BELARUSIAN ACADEMIC SCIENCE: HISTORY, TASKS, PROSPECTS**

## Summary

Here the author makes an attempt to consider the peculiarities of Belarusian academic science formation and to characterize the evolution of its topical field and branches of research.

In connection with it the main achievements of the Institute of Philosophy of the National Academy of Sciences have been shown together with their cultural, educational and world-outlook potential and their significance for Belarusian society development.